ISSN 0321-1649 (print)
УДК 930.1 (09) (БЕИ)

Поступила в редакцию 16.02.2016
Received 16.02.2016

**А. А. Савіч**

*Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна, Брэст, Рэспубліка Беларусь*

# ПАРТЫЗАНСКІ РУХ У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ 1920-х гг.: СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ ДАСЛЕДАВАННЯ

Отечественная историческая наука как в советское время, так и в период суверенной Республики Беларусь демонстрировала устойчивый интерес к истории вооруженного сопротивления западнобелорусского населения польской оккупации как яркому примеру самоотверженной борьбы белорусского народа за преодоление несправедливого Рижского мирного договора. Западнобелорусское партизанское движение вызывало живой отклик в настроениях белорусского народа, было представленно самыми разнообразными политическими силами, действия которых не всегда соотносились с тактическими установками и практическими потребностями большевистского руководства, зависели от разнонаправленных белорусских национальных организаций, а также иностранных военно-политических структур. Поэтому широко озвученнные примеры партизанского сопротивления польским властям получали в 1920-е годы и получают сегодня неоднозначную и противоречивую оценку историков. В статье отражены основные научно-методологические показатели развития отечественной историографии истории партизанского движения в Западной Беларуси в первой половине 1920-х годов. На основании широкого круга историографических и архивных источников представлен процесс развития историографии вопроса, выявлены основные подходы к изучению истории партизанской борьбы, формулировки и оценки деятельности различных течений партизанского движения, сделан вывод о наличии научно-теоретической и источниковедческой базы для монографического изучения темы.

*Ключевые слова:* историография, источники, методология, Западная Беларусь, партизанское движение, политические партии, восстание.

**A. A. Savich**

*Brest State University named after AS Pushkin, Brest, Republic of Belarus*

## PARTISAN MOVEMENT IN WESTERN BELARUS IN THE EARLY 1920s: STATE AND PROSPECTS OF THE STUDY

Guerrilla struggle of the Belarusian people against the Polish occupation after the Polish-Soviet War aroused great interest in the company and is reflected in the pages of periodicals and scientific publications. However, the subject has not acquired a thorough case study that requires its historiographical reflection and discovery of scientific-theoretical bases of source and the objective to create a monographic study. In the article the basic scientific and methodological development of indicators of national historiography history of the guerrilla movement in Western Belarus in the first half of the 1920s. Based on a wide range of historiographical and archival sources identified the stages in the development of the issue of historiography, the main approaches to the study of the history of guerrilla warfare, the formulation and evaluation of the various trends of the partisan movement, concluded that there was scientific-theoretical and source base for the monographic study of the topic.

*Keywords*: historiography, sources, methodology, Western Belarus, the guerrilla movement, political parties, rebellion.

**Уводзіны.** Партызанскі рух у Заходняй Беларусі ў пачатку 1920-х гадоў з'яўляецца яскравым пацвярджэннем імкнення беларускага народа да нацыянальнай кансалідацыі, вызвалення з дапамогай зброі ад умоў, навязаных Беларусі несправядлівым Рыжскім мірам. У ім актыўны ўдзел прымалі прадстаўнікі розных палітычных сіл ад т. зв. «зялёных» фарміраванняў, эсэраўскіх злучэнняў пад сцягам БНР і пры шчыльным узаемадзеянні з літоўскім урадам у г. Коўне, адзінак Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі (БРА) да пракамуністычных атрадаў, якія мелі арганізацыйную падтрымку з боку савецкіх ваенна-разведвальных структур. Заходнебеларуская «партызанка», як у той час называлі паўстанцка-партызанскую барацьбу на беларускіх землях пад Польшчай, выклікала велізарную цікавасць у грамадстве і атрымлівала асвятленне на старонках перыядычных выданняў і навуковых публікацый. Аднак тэма так і не атрымала свайго прадметнага даследавання, што патрабуе яе гістарыяграфічнага асэнсавання і выяўлення навукова-тэарэтычных і крыніцазнаўчых падстаў для стварэння манаграфічнага даследавання.

© Савіч А. А., 2016

**Асноўная частка.** У вывучэнні гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. выразна выяўляюцца тры перыяды, якія адрозніваюцца асноўнымі кампанентамі арганізацыйна-метадалагічнага характару: першы – 1920-я – сярэдзіна 1950-х гадоў; другі – другая палова 1950 – пачатак 1990-х гадоў; трэці, сучасны – 1990–2000-я гады [1, с. 206–215]. Гэтая перыядызацыя распаўсюджваецца і на гісторыю партызанскага руху.

У пачатку 1920-х гадоў у савецкім грамадстве, правадыры якога не страцілі канчаткова надзею на магчымасць рэалізацыі сусветнай рэвалюцыі, актыўна падтрымліваліся настроі варожасці ў дачыненні Польшчы, якая стаяла першай на чарзе да магчымай рэвалюцыянізацыі. Таму шырока папулярызаваныя падзеі партызанскай барацьбы, яркія вобразы правадыроў беларускіх паўстанцаў, найбольш часцей згаданых атаманаў Скамароха і Мухі, сталі неад'емнай часткай тагачаснага агітацыйна-прапагандысцкага дыскурсу [2; 3].

Аўтары публікацый прыхільна-прывітальна ставіліся да частых выпадкаў баявых аперацый беларускіх паўстанцаў з «польскімі акупантамі» ў адказ, як справядліва сцвярджалася, на жорсткі ўціск і шматлікія абмежаванні і злоўжыванні польскай улады ў дачыненні да беларускага насельніцтва. Нягледзячы на стыхійнасць як адну з яскравых рыс адлюстравання партызанскага руху, у публікацыях БССР ва ўзнёсла-рамантычным стылі ўзгадваліся беларускія эсэры як асноўная сіла ўзброенага народнага супраціўлення польскай акупацыі і нацыянальнаму прыгнёту. Такая гістарыяграфічная з'ява ў другой палове 1920-х і ажно да пачатку 1990-х гадоў тлумачылася тым, што эсэраўскі кампанент беларускага нацыянальнага руху быў вельмі важным для бальшавіцкай улады, у тым ліку і для кантролю беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў Польшчы. Таму ўлады БССР не перашкаджалі публікацыі матэрыялаў пра паўстанцкі рух у Заходняй Беларусі і актыўны ўдзел у ім беларускіх эсэраў.

У першай палове 1920-х гадоў ва ўмовах адсутнасці прафесійных кадраў беларускіх гісторыкаў – спецыялістаў па гісторыі Заходняй Беларусі, якія б забяспечылі патрэбнае асвятленне падзей, творы па заходнебеларускай тэматыцы мелі яскрава літаратурна-публіцыстычныя рысы. Так, найбольш значным у фактаграфічным плане творам айчыннай гістарыяграфіі па гісторыі партызанскага руху і па сённяшні час з'яўляецца змястоўны артыкул пісьменніка Змітрака Бядулі «Партызанскі рух у Заходняй Беларусі» ў зборніку «Заходняя Беларусь (1925)», які з'яўляецца характэрным у дачыненні да вышэйадзначаных аспектаў, у тым ліку звязаных з вызначальным удзелам эсэраў у «партызанцы». Прытым, што ў ім прыводзіліся шматлікія згадкі пра падзеі паўстанцкага руху, у тым ліку арганізацыйная праца Скамароха, Чорта, ультыматум Пілсудскаму, пра Беластоцкі працэс і ролю ў правале беларускага падполля В. Маслоўскай, Разумовіча (Хмары), «здрадніка Лянкевіча», шматлікія баявыя аперацыі беларускіх паўстанцаў, артыкул змяшчаў тэматычна актуальны і ў наш час падраздзел «Ці беларускі селянін сапраўды пакорлівы і прыбіты». У ім аўтар выказаўся пра беларускі народ, які «даўно страціўшы сваю дзяржаўную самастойнасць, ня меў магчымасьці выяўляць у гістарычных падзеях сваёй гэроічносьці». Такія беларуска-дзяржаўніцкія разважанні прывялі аўтара да высновы, што мэтай «Беларускага Хаўрусу Вызвалення Бацькаўшчыны», пад аб'яднаннем якога па ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі арганізаваліся невялічкія групы, была «барацьба з польскай окупацыяй за незалежнасьць Беларусі» [4, с. 48, 52]. У тым самым зборніку маецца і раздзел з назвай «Паўстанцкі рух», змест якога напоўнены інфармацыяй пра гучнавядомыя падзеі «заходнебеларускай партызанкі», пры гэтым сцвярджалася, што «ня некалькі год аддзяляе ад шырокага паўстаньня, але яно можа выбухнуць у надыходзячую вясну!» [5, с. 24, 25].

Відавочна, што публікацыі выяўлялі настроі шырокіх колаў беларусаў, звязаных з надзеяй на паспяховае ажыццяўленне плана паўстання ў Заходняй Беларусі. У канцы кастрычніка 1924 г. на II канферэнцыі КПЗБ было прынята рашэнне аб падрыхтоўцы да паўстання, аднак яно было скасавана камінтэрнаўскім кіраўніцтвам паводле настойлівых патрабаванняў польскіх камуністаў. У 1925 г. арганізаваны партызанскі рух быў канчатковы згорнуты, пачалося паступовае прыпыненне, а потым і адмаўленне ад папярэдніх схем яго асвятлення. Гэта тлумачыцца тым, што ў сярэдзіне 1920-х гадоў ва ўмовах стабілізацыі Польшчы савецкая ўлада канчаткова адмовілася ад падкантрольнага ёй партызанскага руху, у тым ліку ў выглядзе «актыўнай разведкі» як спосабу набліжэння Польшчы да рэвалюцыі. Курс на ўзброенае паўстанне быў прызнаны памылковым.

Нежаданне нацыянальна арыентаваных членаў КПЗБ – «сэцэсіі» сіламі якіх II канферэнцыя ўзяла курс на паўстанне, падпарадкоўвацца скасаванню «партызанкі» прывяло да расколу ў партыі. З-за актыўнага ўдзелу ў «сэцэсіі» былых беларускіх эсэраў у савецкім кіраўніцтве яшчэ больш узмацнілася варожа-негатыўнае стаўленне да БПС-Р, таму іх актыўная партызанска-паўстанцкая справа ў Заходняй Беларусі не магла быць аб'ектам увагі, а тым больш усхвалення, як было раней. Асвятленне партызанскага руху робіцца ўсё больш абмежаваным, нягледзячы на тое, што ў 1926 г. пры Інбелкульце была створана адмысловая навуковая ўстанова – Камісія па вывучэнні Заходняй Беларусі [6, арк. 15]. Здавалася б, пасля гэтага заходнебеларуская тэматыка стане больш навукова забяспечанай і праўдзіва-аб'ектыўнай, аднак атрымалася наадварот. Камісія, як і Заходні сектар Інстытута гісторыі Беларускай акадэміі навук, створаны ў 1931 г., у планах якога прысутнічала тэматыка партызанскага руху [7, с. 119], у навукова-метадалагічным сэнсе была накіравана на дапасаванне падзей Заходняй Беларусі да патрэб бальшавіцка-камінтэрнаўскага кіраўніцтва, якое не задавальняла папярэдняя канцэпцыя партызанскага руху з актыўнай прысутнасцю эсэраў. Таму ў публікацыях усё больш яскрава выяўляецца імкненне да замоўчвання «эсэраўскай партызанкі», ілюстрацыі стыхійнасці са згадкай няўлоўнага Мухі-Міхальскага як сімвала супраціўлення рэжыму гвалту і тэрору, як, напрыклад, у М. Лучаніна ў раздзеле пад красамоўнай назвай «Партызаншчына» [8, с. 51–53]. І хоць тэма беларускіх партызан згадвалася ў савецкіх газетах у кантэксце асуджэння жорсткай расправы польскай улады над беларускім народам [9–11], яна ў тагачасным ідэйна-палітычным кантэксце стала губляць сваю актуальнасць. Пры гэтым, ва ўмовах Рыжскага міру, інфармацыя ў савецкім друку аб актыўным выкарыстанні савецкім бокам ваенна-дыверсійных атрадаў, якія ў адпаведнасці з канцэпцыяй «актыўнай разведкі» засылаліся ў Заходнюю Беларусь з тэрыторыі БССР, была недапушчальнай, таму ў публікацыях адпаведныя ўзброеныя аддзелы і іх кіраўнікі не фігуравалі.

Вірлівыя падзеі, звязаныя з дзейнасцю Грамады, адсунулі з авансцэны савецкай гістарыяграфіі Заходняй Беларусі гісторыю «партызанкі». У канцы 1920-х гадоў гэта было на руку бальшавіцкім дзеячам, у тым ліку і арганізатарам паўстанцка-партызанскага руху, напрыклад У. Ігнатоўскаму: ва ўмовах паступовага абвастрэння ўнутрыпартыйнай барацьбы шчыльная сувязь з былымі паплечнікамі, а зараз ідэйнымі ворагамі – эсэрамі, была падставай для бесцырымонных нападак з боку інтэрнацыянальна арыентаваных канкурэнтаў. Аднак па-за межамі БССР асэнсаванне гераічных падзей паўстанцкай справы атрымала больш шырокі водгук і адлюстраванне, у першую чаргу актыўнымі ўдзельнікамі – арганізатарамі паўстанцкана руху. Яркай з'явай айчыннай гістарыяграфіі праблемы з'яўляецца апублікаваны ў 1930 г. на чэшскай мове ў Празе наратыўны твор В. Разумовіча (Хмары) «Грымасы сьвятовай валькі. Успамінкі атамана партызана» з цікавым, падрабязным, суб'ектыўным матэрыялам пра партызанскі рух у Заходняй Беларусі [12, арк. 148–155].

Беларуская савецкая версія гісторыі партызанскай барацьбы ў драматычных падзеях арганізаванай на беларускую інтэлігенцыю атакі канца 1920 – пачатку 1930-х гадоў, дыскрэдытацыі беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі, роспуску КПЗБ, разгрому кадраў беларускай гістарычнай навукі ў сярэдзіне 1930-х гадоў звузілася да прымітыўнай схемы, у якой барацьба беларускага народа паказвалася як стыхійны працэс, выкладалася павярхоўна, узброеныя выступленні былі кваліфікаваны як сялянскія [13, с. 32, 34; 14, с. 19].

На фоне відавочнага звужэння прадмета даследавання, імкнення ігнаравання эсэраўска-бэнээраўскага ўплыву ў арганізацыі вайскова-партызанскіх адзінак, замоўчвання КПЗБ як пралетарскай партыі ў справе функцыянавання ваеннага фактару камінтэрнаўскай палітыкі, спробы больш глыбокага аналізу і адлюстравання партызанскай тэматыкі прыводзілі да відавочных супярэчнасцей. Так, рэдагаванае М. Нікольскім і І. Лочмелем выданне, справядліва называючы партызанскі рух 1921–1925 гг. непасрэдным працягам партызанскай барацьбы 1920 г., пацвярджаючы тэзіс аб стыхійнасці, падае партызанскія атрады сялянскімі. Пры гэтым перыяд 1922–1923 гг. – час эсэраўска-бэнээраўскага супрацоўніцтва з літоўскімі ўладамі – пададзены як час, калі «барацьба беларускага народа супраць акупантаў набывае характар сапраўднай вайны, у якой з абодвух бакоў прымалі ўдзел значныя вайсковыя сілы». У выданні была сфармулявана больш ёмістая ў параўнанні з папярэдняй схема сутнасці і характару партызанскага руху. Маючы на ўвазе прыяры-

тэты марксісцка-ленінскай метадалогіі, гісторыкі справядліва канстатавалі адсутнасць яскрава акрэсленага класавага характару і дастатковай арганізацыі партызанскіх выступленняў. Улічваючы эсэраўска-бэнээраўскі фактар, яны сцвярджалі, што «беларускія буржуазныя нацыяналісты» імкнуліся затрымаць развіццё масавага нацыянальна-вызваленчага руху, накіраваць яго на шлях «абмежаванага нацыяналізму». Аднак камуністычныя арганізацыі былі нешматлікія і недастаткова моцныя, каб «ахапіць сваім кіраўніцтвам і арганізаваць масавы паўстанцкі рух». Так уводзілася думка аб тым, што «з ростам камуністычнай партыі ў Заходняй Беларусі, арганізацыяй камуністычных ячэек у сельскай мясцовасці барацьба народных мас прымала ўсё больш арганізаваны характар» [15, с. 53]. Але сёння вядома, што канстатаванае «ўзмацненне» КПЗБ прывяло да скасавання ў 1925 г. партызанскага руху па волі яе прапольскага кіраўніцтва. Як праяву аб'ектыўнасці можна кваліфікаваць выказванне гісторыкаў пра існаванне ў перыяд 1924–1925 гг. на тэрыторыі Заходняй Беларусі шэрагу камуністычных арганізацый, якія кіравалі партызанска-паўстанцкім рухам. Сапраўды, раскол у КПЗБ у выніку дзейнасці «сэцэсіі» і розныя падыходы ў партыі да перспектыў узброенага змагання з боку дзвюх груповак у партыі мелі месца ў пракамуністычным партызанскім руху Заходняй Беларусі.

Пасля палітычнай рэабілітацыі КПЗБ у час працы ХХ з'езда КПСС у БССР актывізавалася даследаванне гісторыі Заходняй Беларусі, і, нягледзячы на панаванне ў агульнай структуры даследаванняў гісторыка-партыйнай тэматыкі – КПЗБ, па многіх пытаннях можна заўважыць станоўчую дынаміку ў параўнанні з папярэднім перыядам [1, с. 47–75]. Але гэта слаба закранула гісторыю партызанскага руху, у асвятленні якога амаль нязменнымі захаваліся ўсталяваныя ў 1930-я гады штампы. Што было зроблена відавочна, дык гэта насаджэнне культу КПЗБ як партыі, якая гераічна змагалася і была адзінай арганізацыйнай стваральнай сілай партызанскай барацьбы, але была незаконна рэпрэсіравана і гістарыяграфічна занядбана.

Адказныя супрацоўнікі партыйна-дзяржаўных ідэалагічных структур старанна пільнавалі, каб праўда пра сапраўдны партызанскі рух не дайшла да грамадскасці. На гэта была накіравана адпаведная канцэптуальная схема, якая была распрацавана ў другой палове 1950-х гадоў, апублікавана на старонках партыйнага друку і з'яўлялася асновай для адлюстравання гісторыі Заходняй Беларусі. Вялікая роля ў гэтым плане належала Інстытуту гісторыі партыі пры ЦК КПБ, у якім заходнебеларускую праблематыку курыраваў М. Арэхва [16]. Па сведчанні архіўных крыніц, менавіта ён ажыццяўляў канчатковую карэкціроўку і рэдагаванне публікацый па гісторыі Заходняй Беларусі, у тым ліку па «партызанцы». Апрача іншага, схема не дапускала, як і ў 1920–1930-я гады, згадак пра інспіраванне і падтрымку партызанскага руху з боку савецкага кіраўніцтва. У гэтым плане заслугоўвае ўвагі рэцэнзія М. Арэхвы на кнігу ўспамінаў аднаго з кіраўнікоў партызанскага руху С. Ваўпшасава. Яе характэрны бальшавіцкі кантэкст з'яўляецца красамоўным сведчаннем ідэйна-палітычнай абумоўленасці адлюстравання ў другой палове 1950-х – 1980-я гады гісторыі партызанскай барацьбы. На фоне шчырых разважанняў аб інспіраванні і кіраўніцтве ўзброенымі атрадамі з Мінска ва ўмовах слабасці кампартыі М. Арэхва забараняе «показывать инспирирующую роль Минска в деятельности этих отрядов, происходившей на территории Польши... Нельзя не из-за Народной Польши, теперешние руководители которой, в прошлом члены Компартии Польши, это знают, а из-за сегодня существующего капиталистического окружения» (падкрэслена ў дакуменце. – *А. С.*). Таму трэба было з тэксту прыбраць усякія згадкі пра ЦК КП(б)Б, Мінск, савецка-польскую мяжу, «умело заменив их до 1923 г. ссылками на руководящие органы КПРП, а с осени 1923 г. – на КПЗБ, или в отдельных случаях совсем устранив». С. Ваўпшасаву рэкамендавалася «устранить упоминание о том, что автору «...пришлось руководить партизанским отрядом особого назначения... с начала 1920 по 1925 г.» Пры гэтым указвалася неабходнасць наяўнасці інфармацыі аб спачуванні працоўных БССР сваім братам – заходнебеларускім паўстанцам. Клапоцячыся аб савецка-польскай згодзе, рэцэнзент раіў не даваць апісання франтавых эпізодаў і дзеянняў у тыле ў час савецка-польскай вайны, іншая справа – паўстанцкі рух на акупаванай і гвалтоўна ўключанай у склад Польшчы тэрыторыі Заходняй Беларусі [17, арк. 13–16].

Нядзіўна, што ва ўмовах аднаўлення і пашырэння прадмета гісторыі Заходняй Беларусі яго партызанская складаючая заставалася без істотных змен. Найбольш значныя і змястоўныя

публікацыі са згадкай гісторыі партызанскага руху І. Палуяна і У. Палуяна, А. Сарокіна, М. Сташкевіча, калектыўная манаграфія па гісторыі КПЗБ мелі відавочныя праявы схематызму, спрошчвання і тэндэнцыйнасці, імкнення ігнараваць у партызанскім руху палітычныя сілы, у тым ліку ў КПЗБ, накіраваныя на дасягненне беларускіх незалежніцкіх дзяржаўна-палітычных планаў [18–21].

Партызанскі рух даследчыкамі кваліфікаваўся як сялянскі, што з'яўляецца відавочным перабольшаннем і спрашчэннем. Савецкія гісторыкі падкрэслівалі першапачатковую стыхійнасць «заходнебеларускай партызанкі» да таго, як была створана КПЗБ, якая ўзначаліла партызанскі рух. Удзел у арганізацыі ўзброенага змагання беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый і арганізацый даследчыкі хоць і не адмаўлялі, але мінімалізавалі і рознымі спосабамі дыскрэдытавалі, адзначаючы шкоднасць заўчасных стыхійных выступленняў, да якіх штурхалі, як падавалася, «авантурыстычныя элементы эсэраўскага кірунку». Дзейнасць жа партызанскіх атрадаў пад агульным камандаваннем камуністаў, якія, як вядома, атрымлівалі дапамогу і падтрымку ў БССР і СССР, ідэалізавалася і атрымала высокую ацэнку. Тэма так і не стала самастойным кірункам навуковага даследавання, нягледзячы на яе відавочную актуальнасць і выкарыстанне ў структуры заходнебеларускай тэматыкі як найбольш яркага прыкладу беларускага нацыянальна-вызваленчага руху першай паловы 1920-х гадоў [1, с. 146–154].

Гісторыя партызанскага руху ў Заходняй Беларусі атрымала паглыбленае ўдакладненне і папулярызацыю на старонках выданняў, адрасаваных шырокаму колу чытачоў, у якіх падрабязна раскрываліся разнастайныя аспекты дзейнасці камуністычных партызанскіх атрадаў пад кіраўніцтвам С. Ваўпшасава, К. Арлоўскага, арганізацыі падпольна-дыверсійнай працы ў Заходняй Беларусі [22; 23]. І хоць дакументальная аповесць І. Барысава выйшла ў 1991 г., калі пачынаўся новы перыяд гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі незалежнай Рэспублікі Беларусь, канцэптуальна яна з'яўляецца яскравым прыкладам савецкай гістарычнай навукі, накіраванай на ўсталяванне гераічных вобразаў партызанаў-чэкістаў.

Адзначым, што фактаграфічны бок даследаванняў у параўнанні з публікацыямі сярэдзіны 1920-х гадоў не выявіў больш глыбокага адлюстравання падзей, нягледзячы на тое, што ў архівах БССР, Літоўскай ССР і Польшчы захоўвалася вялікая колькасць разнастайных дакументаў з рознай ступенню рэпрэзентатыўнасці, з якімі беларускія гісторыкі працавалі, але не змаглі праўна выкарыстаць іх інфармацыю для аб'ектыўнай рэканструкцыі падзей. Таму прыведзеныя вышэй звесткі публікацый 1920-х гадоў маюць больш грунтоўную фактаграфічную базу і змястоўныя гістарычныя факты, якія ў 50–80-я гады XX ст. не маглі згадвацца па агучаных вышэй прычынах.

У сярэдзіне 1990-х гадоў у выніку арганізацыйна-метадалагічнага ўдасканалення вывучэння гісторыі Заходняй Беларусі, і ў першую чаргу рассакрэчвання ахіўных дакументаў [1, с. 155–168], беларуская гістарыяграфія папоўнілася публікацыямі, якія істотна ўдакладнялі савецкую версію гісторыі партызанскага руху [24–28]. У іх удакладняўся тэзіс аб вызначальнай ролі КПЗБ у партызанскім руху з акцэнтацыяй на вызначальным удзеле ў ім беларускіх эсэраў, ваенна-палітычнай зацікаўленасці «заходнебеларускай партызанкай» і падтрымцы савецкім бокам пракамуністычных партызанскіх адзінак. Асаблівую ўвагу прыцягвае інфармацыя Ю. Стасевіча аб перападпарадкаванні атрадаў эсэраў і БРА савецкаму кіраўніцтву і версія згортвання партызанскага руху па жаданні польскіх камуністаў і загадзе з Масквы.

Паступова гістарыяграфія праблемы пачала ўзбагачацца напрацоўкамі, якія грунтаваліся на значнай крыніцазнаўчай базе, у тым ліку на падставе польскіх, расійскіх і літоўскіх дакументаў. Факталагічнай навізной характарызуюцца даследаванні М. Касцюка, які на падставе расійскіх архіўных матэрыялаў пацвердзіў думку аб прамой падтрымцы партызанскага руху ў Заходняй Беларусі кіраўніцтвам СССР і БССР [29, с. 180–195], І. Коўкеля і А. Чарнякевіча [30; 31], В. Хвірысюка [32], у якіх пададзены асноўныя фрагменты арганізацыі партызанскага руху, у першую чаргу эсэраўскага кірунку, яго сувязі і падтрымкі з боку Літвы і ўраду БНР В. Ластоўскага, супрацоўніцтва беларускіх эсэраў з камуністычнымі ўладамі БССР. Прынцыпова важным стала асэнсаванне складанасці і драматызму партызанскага руху, калі беларусы па абодва бакі мяжы «згодна з чужымі палітычнымі планамі… уцягваліся ў грамадзянскую вайну» [33, с. 258].

Навукова-папулярная традыцыя адлюстравання заходнебеларускага антыпольскага супраціўлення, апрача традыцыйных узнёсла-прывітальных адносін да партызан, сфарміравала і значны масіў адмоўна-негатыўных характарыстык валюнтарысцкіх памкненняў бальшавіцкага кіраўніцтва, учынкаў падкантрольных яму атрадаў і іх кіраўнікоў, акцэнтуючы ўвагу на бандыцкарабаўніцкіх праявах іх дзеянняў і нізкіх маральна-чалавечых якасцях [34; 35].

Такім чынам, партызанскі рух Заходняй Беларусі на працягу 1920–2000-х гадоў быў адной з найбольш актуальных тэм заходнебеларускай праблематыкі, па якой была напрацавана значная навукова-тэарэтычная база. Аднак, нягледзячы на гэта, у тым ліку на паляпшэнне метадалагічнаарганізацыйных умоў функцыянавання айчыннай гістарыяграфіі ў Рэспубліцы Беларусь, тэма так і не атрымала манаграфічнага даследавання. У той жа час польскія гісторыкі В. Сляшынскі і П. Ціхарацкі [36; 37], расійскія І. Ліндэр і С. Чуркін [38] і літоўскія Э. Гімжаўскас і А. Каспаравічус [39; 40] у апошнія гады выдалі шэраг прац з высокай ступенню навукова-тэарэтычнага і фактаграфічнага забеспячэння. Айчынная гістарычная навука яшчэ чакае скрупулёзнага даследчыка, які здзейсніць аб'ектыўную рэканструкцыю і інтэрпрэтацыю гісторыі партызанскага руху, скарыстаўшы ў тым ліку і значныя крыніцазнаўчыя і навукова-тэарэтычныя напрацоўкі папярэднікаў. Асаблівую ўвагу ў гэтым сэнсе маюць крыніцазнаўчыя магчымасці даследавання гісторыі партызанскага руху, якія пацвярджаюцца як апублікаванымі дакументамі [41–46], так і новымі матэрыяламі айчынных і замежных архіваў. Прыцягваюць увагу даныя пра кансалідацыю ў 1919–1920 гг. беларускіх і літоўскіх антыпольскіх сіл, звесткі аб якіх утрымліваюць матэрыялы Расійскага дзяржаўнага архіва сацыяльна-палітычнай гісторыі [47]. Там жа захоўваецца надзвычай цікавая сваёй падрабязнай змястоўнасцю архіўная справа «Докладная записка и заключения, составленные Представительством КПП и Представительством КПЗБ на бывших участников партизанского движения на территории Западной Белоруссии в 1923–1925 гг. с приложениями» [48].

Відавочным недахопам гістарыяграфіі пытання з'яўляецца ігнараванне найважнейшай умовы існавання паўстанцка-партызанскага руху – падполля, у той час як у айчынных архівах існуе велізарны масіў дакументаў, які адлюстроўвае стварэнне і існаванне такога асяродку ў Заходняй Беларусі як бальшавіцкай скіраванасці, так і эсэраўска-бэнээраўскай [49–57]. Прынцыпова варта адзначыць, што адпаведныя дакументы маюць не толькі савецкае, польскае, літоўскае паходжанне, але і ваенна-палітычных структур БНР і беларускіх эсэраў, якія забяспечвалі арганізацыю паўстанцкага падполля ў Заходняй Беларусі. У прыватнасці, сцвярджэнне аб аднабаковым выкарыстанні літоўскім ковенскім урадам беларускіх партызан для вырашэння сваіх ваеннапалітычных задач з'яўляецца спрашчэннем тагачаснай сітуацыі. Справа ў тым, што акрамя здабыткаў, якія зыходзілі з беларуска-літоўскага пагаднення, на практыцы, у паўсядзённай працы па наладжванні партызанскай справы пад шыльдай гэтага хаўрусу, беларускія актывісты на літоўскія грошы ажыццяўлялі арганізацыю беларускага падполля як базы для будучага антыпольскага паўстання. З архіўных крыніц вядома, як па канспіратыўных каналах адпаведная інфармацыя ў выглядзе справаздач адказных асоб міма літоўскіх «вачэй» трапляла да кіраўнікоў беларускага руху [57, арк. 21].

Існуе неабходнасць паглыбленага даследавання гісторыі беларуска-польска-літоўскага памежжа, на якім розныя палітычныя сілы актыўна выкарыстоўвалі беларускую рыторыку для інспірацыі адпаведных ваенна-палітычных настрояў і асяродкаў [1, с. 198–199]. Тут адбывалася супрацьстаянне, але было, напэўна, і патаемнае супрацоўніцтва польскай, літоўскай і савецкай спецслужбаў. Савецкая разведка шырока выкарыстоўвала падпольныя магчымасці камуністычнай партыі, забяспечваючы функцыянаванне праходаў праз мяжу, пераправу грошай і літаратуры ва ўзаемадзеянні з пагранатрадамі. Польскія ўлады пра гэта ведалі, паводле інфармацыі Брэсцкай павятовай камендатуры ад 25 лютага 1927 г., «усе камуністычныя ці камунізуючыя арганізацыі застаюцца на паслугах савецкай разведкі» [50, арк. 140]. Архіўныя дакументы змяшчаюць шмат інфармацыі пра выкарыстанне актуалізаванага і пэўным чынам рэалізаванага беларускага пытання разнастайнымі палітычнымі сіламі. У першую чаргу выклікаюць увагу выкрытыя польскімі спецслужбамі буйныя падпольна-паўстанцкія арганізацыі колькасцю ў некалькі дзясяткаў асоб, віна якіх была даказана. Яны на беларуска-польскім памежжы стваралі ўзброеныя атрады

як быццам з мэтай вызвалення Беларусі. Такія звесткі патрабуюць уважлівага навуковага аналізу, суаднясення і супастаўлення з дакладнымі звесткамі аб узброеных сутычках у пачатку 1920-х гадоў паміж савецкімі, польскімі, літоўскімі і беларускімі сіламі. Так, паводле справаздачы органаў дэфензівы адносна выкрытай бальшавіцкай паўстанцкай арганізацыі, «праца тая праводзілася патаемна, што нават не ўсе члены той арганізацыі ведалі, што акцыяй кіруюць саветы», а былі перакананы, што гэта беларускі рух [49, арк. 201, 270–276]. Скаладаныя і супярэчлівыя звесткі адносна атрадаў «Зялёнага Дуба» і С. Булак-Балаховіча патрабуюць улічваць у гісторыі партызанскага руху і гэты важны кампанент ваенна-палітычнай гісторыі Заходняй Беларусі [35; 58; 59].

**Заключэнне.** Такім чынам, у айчыннай гістарыяграфіі існуюць падставы метадалагічнага і крыніцазнаўчага характару для распрацоўкі гісторыі партызанскага руху на манаграфічным узроўні. «Заходнебеларуская партызанка» патрабуе прадметнага вывучэння, якое дасць узгодненую інтэрпрэтацыю яе ўзнікнення, развіцця і згортвання, удзелу ў «партызанцы» прадстаўнікоў нацыянальна-дэмакратычнай плыні, у тым ліку фарміраванняў, якія лічылі сябе войскамі БНР. Раскіданыя па розных выданнях звесткі пра палітыку савецкага і камінтэрнаўскага кіраўніцтва па арганізацыі ўзброеных антыпольскіх фарміраванняў, іх узаемадзеянні з камуністычным падполлем, фінансаванне і матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне, узбраенне, аналагічнага кшталту пытанні арганізацыі «эсэраўска-бэнээраўскай партызанкі», яе сувязей з замежнымі прадстаўніцтвамі, у тым ліку з літоўскімі ўладамі, павінны быць зведзены ў адно даследаванне. Асаблівай увагі патрабуе вызначэнне сапраўднай ролі ў інспірацыі «партызанкі» арганізаваных ачагоў беларускага руху – Беларускага Хаўрусу Вызвалення Бацькаўшчыны, Беларускага вайскова-палітычнага камітэта, Беларускага брацтва, Саюза сялянскай самаабароны, адэкватнай ацэнкі дзейнасці БПС-Р, БРА, КПЗБ.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Савіч, А. А. Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі (1921–1939 гады) : гістарыяграфія праблемы : манаграфія / А. А. Савіч ; навук. рэд. А. А. Каваленя. – Брэст : БрДУ імя А. С. Пушкіна, 2012. – 288 с.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 60п. Воп. 3. Спр. 576.
3. НАРБ. – Ф. 60п. Воп. 3. Спр. 582.
4. Бядуля, З. Партызанскі рух у Заходняй Беларусі / З. Бядуля // Заходняя Беларусь. – Менск : ДБВ, 1925. – С. 48–68.
5. Заходняя Беларусь. – Менск : ДБВ, 1925. – 68 с.
6. Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі. – Ф. 68. Воп. 1. Спр. 3.
7. Вахтомаў, Г. В. Станаўленне гістарыяграфіі рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі / Г. В. Вахтомаў, У. М. Міхнюк // Вес. АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1988. – № 5. – С. 118–125.
8. Лучанін, М. Заходняя Беларусь пад панаваньнем Польшчы / М. Лучанін. – Менск : Беларус. дзярж. выд., 1926. – 56 с.
9. Смертный приговор партизанам // Правда. – 1925. – 13 мая.
10. Дзейнасць партызанаў // Савецкая Беларусь. – 1925. – 29 мая.
11. У Заходняй Беларусі. Суд над партызанамі // Савецкая Беларусь. – 1925. – 7 снеж.
12. НАРБ. – Ф. 60п. Воп. 3. Спр. 587.
13. Егоров, Г. Западная Белоруссия / Г. Егоров. – М. : Гос. изд-во полит. лит., 1939. – 40 с.
14. Гарбуноў, Ц. Год пад сцягам саветаў / Ц. Гарбуноў. – Мінск : Дзярж. выд-ва пры СНК. Рэд. паліт. літ. 1940. – 56 с.
15. Заходняя Беларусь пад панскім гнётам і яе вызваленне / пад рэд. Н. М. Нікольскага і І. Ф. Лочмеля. – Мінск : Выд-ва АН БССР, 1940. – 96 с.
16. Савіч, А. А. М. С. Арэхва як арганізатар даследавання Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. / А. А. Савіч // Личность в истории: героическое и трагическое: сб. материалов Пятой междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 20-летию ист. фак., Брест, 23–24 ноября 2011 г. / Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина ; редкол.: М. Э. Чесновский (гл. ред.) [и др.]. – Брест: БрГУ, 2012. – С. 196–200.
17. НАРБ. – Ф. 1440. Оп. 3. Д. 1103.
18. Полуян, В. А. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920–1939 гг. / В. А. Полуян, И. В. Полуян. – Минск : Госиздат, 1962. – 222 с.
19. Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921–1939 гг.) / А. Н. Мацко [и др.] ; под ред. А. Н. Мацко и В. Е. Самутина. – Минск : Беларусь, 1966. – 403 с.
20. Сорокин, А. А. Революционное и освободительное крестьянское движение в Западной Белоруссии (1920–1939 гг.) / А. А. Сорокин. – Минск : БГУ, 1970. – 171 с.
21. Сташкевич, Н. С. Приговор революции: крушение антисоветского движения в Белоруссии. 1917–1925 / Н. С. Сташкевич. – Минск : Университетское, 1985. – 304 с.
22. Ваўпшасаў, С. А. На разгневанай зямлі / С. А. Ваўпшасаў / Літ. апрац. В. Бурносаў. – Мінск : Дзяржвыд. БССР. Рэд. сац.-экан. літ., 1963. – 232 с.

23. Борисов, И. Человек из легенды : док. повесть / И. Борисов ; вступ. слово А. Рудака. – Минск : Маст. літ., 1991. – 335 с.

24. Ладысеў, У. Ф. Цяжкі шлях выпрабаванняў / У. Ф. Ладысеў // Беларус. гіст. часоп. – 1994. – № 1. – С. 81–88.

25. Фадзееў, Л. Кірыла Арлоўскі: герой ці бандыт? / Л. Фадзееў // Свабода. – 1994. – 13–19 снеж. – С. 6.

26. Стасевіч, Ю. Партызанка Заходняй Беларусі / Ю. Стасевіч // Пагоня. – 1995. – 17–23 сак., 24–30 сак.

27. Грыцкевіч, А. Гісторыя геапалітыкі Беларусі / А. Грыцкевіч // Спадчына. – 1994. – № 4. – С. 48–61.

28. Мезга, М. Мяжа канфрантацыі (становішча Заходняй Беларусі пасля падпісання Рыжскай дамовы 1921 г.) / М. Мезга // Беларус. мінуўшчына. – 1996. – № 2. – С. 29–31.

29. Касцюк, М. П. Сістэма бальшавіцкай улады на Беларусі / М. П. Касцюк. – Мінск : ВП «Экаперспектыва», 2000. – 308 с.

30. Коўкель, І. І. Польска-літоўскі канфлікт і роля ў ім беларускіх палітычных партый і арганізацый / І. І. Коўкель // Беларусіка=Albaruthenica: Кн. 3 : Нацыянальныя і рэгіянальныя культуры, іх узаемадзеянне / рэд.: А. Мальдзіс [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – С. 259–269.

31. Коўкель, І. І. Партызанскі рух на Гродзеншчыне ў 1921–1925 гадах / І. І. Коўкель, А. М. Чарнякевіч // Слонімшчына вачыма навукоўцаў і краязнаўцаў : матэрыялы рэгіян. гіст.-краязн. канф., прысвеч. 750-годдзю г. Слоніма і 70-годдзю заснавання Слонімскага раённага краязнаўчага музея імя І. І. Стаброўскага / склад. : Д. С. Аляшкевіч, І. П. Крэнь ; пад рэд. І. П. Крэня. – Слонім : Слонімская друкарня, 2002. – С. 254–259.

32. Хвірысюк, В. М. Арганізацыя партызанскай барацьбы ў Заходняй Беларусі супраць польскіх уладаў у 1921–1922 гг. / В. М. Хвірысюк // Берасцейскі хранограф. – 1999. – Вып. 2. – С. 92–100.

33. Стужынская, Н. І. Беларусь мяцежная: з гісторыі ўзброенага антысавецкага супраціўлення ў 20-я гг. XX стагоддзя. Выданне другое, пашыранае / Н. І. Стужынская. – Вільня : Наша будучыня, 2011. – 384 с.

34. Татаренко, А. Недозволенная память. Западная Беларусь в документах и фактах: 1921–1954-е годы / А. Татаренко. – СПб. : Архив АТ, 2006. – 808 с.

35. Тарас, А. Е. Анатомия ненависти / А. Е. Тарас. – Минск : Харвест, 2012. – 798 с.

36. Śleszyński, W. Bezpieczeństwo wewnętrzne w polityce państwa polskiego na ziemiach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej / W. Śleszyński. – Warszawa : RYTM, 2007. – 400 s.

37. Cichoracki, P. Stołpce – Łowcza – Leśna 1924: II Rzeczpospolita wobec najpoważniejszych incydentów zbrojnych w województwach północno-wschodnich / Piotr Cichoracki. – Łomianki: LTW, 2012. – 337 s.

38. Линдер, И. Красная паутина: тайны разведки Коминтерна. 1919–1943 / И. Линдер, С. Чуркин. – М. : РИПОЛ классик, 2005. – 686 с.

39. Гімжаўскас, Э. Беларускі фактар пры фарміраванні літоўскай дзяржавы ў 1915–1923 гг. / Эдмундас Гімжаўскас. – 2-е выд. – Смаленск : Інбелкульт, 2013. – 216 с.

40. Каспаравічус, А. Палітычная роля беларусаў у дыпламатычнай гульні Коўна і Масквы ў 1920–1925 гг. / А. Каспаравічус // ARCHE Пачатак. – 2009. – № 9 (84). – С. 221–253.

41. Материалы особой папки Политбюро ЦК РКП(б) – ВКП(б) по вопросу советско-польских отношений. 1923–1945. – М.: Ин-т славяноведения и балканистики РАН, 1997. – 74 с.

42. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. – Т. 1. – Кн. 1 / Бел. ін-т навукі і мастацтва. Т-ва беларус. пісьменства. Наша Ніва. – Вільня – Нью-Ёрк – Мінск – Прага, 1998. – 866 с.; Кн. 2. – Вільня – Нью-Ёрк – Мінск – Прага, 1998. – 1721 с.

43. Знешняя палітыка Беларусі : зб. дак. і матэрыялаў : у 8 т. Т. 1 : 1917–1922 гг. / склад.: У. М. Міхнюк [і інш.] ; рэдкал.: І. І. Антановіч [і інш.]. – Мінск : БелНДІДАС, 1997. – 398 с.; Т. 2 : 1923–1927 гг. / склад.: У. М. Міхнюк [і інш.] ; рэдкал.: І. І. Антановіч [і інш.]. – Мінск : БелНДІДАС, 1999. – 461 с.

44. Коминтерн против фашизма : док. – М. : Наука, 1999. – 505 с.

45. Политбюро ЦК РКП(б) – ВКП(б) и Коминтерн, 1919–1943 : док. – М. : Росспэн, 2004. – 958 с.

46. Кароткі нарыс беларускага пытання / рэд.: А. Пашкевіч, А. Вашкевіч, А. Чарнякевіч. – Мінск : І. П. Логвінаў, 2009. – 395 с.

47. Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі (РДзАСПГ). – Ф. 17. Воп. 63. Спр. 16.

48. РДзАСПГ. – Ф. 495. Воп. 123. Спр. 249.

49. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДзАБВ). – Ф. 67. Воп. 4. Спр. 27.

50. ДзАБВ. – Ф. 92. Воп. 1. Спр. 130.

51. ДзАБВ. – Ф. 2028. Воп. 1. Спр. 37.

52. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДзАГВ). – Ф. 200. Воп. 2. Спр. 7.

53. ДзАГВ. – Ф. 551. Воп. 1. Спр. 126.

54. НАРБ. – Ф. 60п. Воп. 3. Спр. 587.

55. НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 2. Спр. 11.

56. НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 2. Спр. 12.

57. НАРБ. – Ф. 325. Воп. 1. Спр. 57.

58. Чарнякевіч, А. Кароткі нарыс гісторыі ўзаемаадносін беларускага нацыянальнага руху і II аддзела Галоўнага камандавання (Генеральнага штаба) Войска Польскага ў 1918–1923 гг. / А. Чарнякевіч, А. Пашкевіч // ARCHE Пачатак. – 2009. – № 8. – С. 22–73.

59. Сыч, Р. Арганізацыя «Зялёны Дуб»: антыпольскі аспект дзейнасці / Р. Сыч // Моўнакультурная прастора Брэсцка-Пінскага Палесся : зб. навук. арт. : у 2 ч. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна, Каф. гісторыі беларус. мовы і дыялекталогіі ; рэдкал.: М. М. Аляхновіч [і інш.]. – Брэст : Альтэрнатыва, 2011. – Ч. 2. – С. 135–138.

## References

1. Savich, A. A. (2012) *Natsyyanal'na-vyzvalenchy rukh u Zakhodnyai Belarusi (1921-1939 gady): gistaryyagrafiya prablemy: managrafiya* [The national liberation movement in Western Belarus (1921-1939 years): historiography of the problem: monograph], BrSU, Brest, BY

2. *Natsyyanal'ny arkhiŭ Respubliki Belarus'* [National Archive of the Republic of Belarus] (NARB). F. 60p. L. 3. C. 576.

3. *NARB*. F. 60p. L. 3. C. 582.

4. Byadulya, Z. (1925) "Partisan movement in Western Belarus", *Zakhodnyaya Belarus'* [Western Belarus], DBV, Mensk, BY, pp. 48-68.

5. (1925) *Zakhodnyaya Belarus'* [Western Belarus], DBV, Mensk, BY

6. *Tsentral'ny navukovy arkhiŭ NAN B* [Central Scientific Archive of NAS B]. F. 68. L. 1. C. 3.

7. Vakhtomaŭ, G. V. and Mikhnyuk, U. M. (1988) "Formation of historiography of revolutionary movement in Western Belarus", *Vestsi AN BSSR Ser. gramad. Navuk*, [Lead Academy of Sciences BSSR. Series of Social Sciences], no. 5, pp. 118-125.

8. Luchanin, M. (1926) *Zakhodnyaya Belarus' pad panavannem Pol'shchy* [Western Belarus under the rule of Poland], Belarusian State Publishing, Mensk, BY

9. (1925) "The death penalty partisans", *Pravda* [Truth], 13 maya.

10. (1925) "Activities partisans", *Savetskaya Belarus'* [Soviet Belarus], 29 maya.

11. (1925) "In Western Belarus. The trial of the partisans", *Savetskaya Belarus*' [Soviet Belarus], 7 snezh.

12. *NARB*. F. 60p. L. 3. C. 587.

13. Egorov, G. (1939) *Zapadnaya Belorussiya* [Western Belarus], Gos. izd-vo polit. lit-ry, Moscow, RU

14. Garbunoŭ, C. (1940) *God pad stsyagam savetaŭ* [Year under the banner of Soviet], Dzyarzh. vyd-va pry SNK. Red. palit. lit-ry, Minsk, BY

15. (1940) *Zakhodnyaya Belarus' pad panskim gnetam i yae vyzvalenne* [Western Belarus under the landlord yoke and its liberation], Vyd-va AN BSSR, Minsk, BY

16. Savich, A. A. (2012) "M. S. Arjehva as the organizer of the study Western Belarus", *Lichnost' v istorii: geroicheskoe i tragicheskoe: sbornik materialov Pyatoi mezhdunar. nauch.-prakt. konf., posvyashch. 20-letiyu istor. fakul'teta, Brest, 23-24 noyabrya 2011 g.* [Person in history: the heroic and tragic: a collection of materials of the Fifth international scientific and practical conference dedicated to the 20th anniversary of the Faculty of History, Brest, 23-24 November 2011], Brest, pp. 196-200.

17. *NARB*. F. 1440. L. 3. C. 1103.

18. Poluyan, V. A. (1962) *Revolyutsionnoe i natsional'no-osvoboditel'noe dvizhenie v Zapadnoi Belorussii v 1920-1939 gg.* [The revolutionary and national liberation movement in Western Belarus in 1920-1939 gg.], Gosizdat, Minsk, BY

19. (1966) *Revolyutsionnyi put' Kompartii Zapadnoi Belorussii (1921-1939 gg.)* [A revolutionary way of the Communist Party of Western Belarus (1921-1939)], Belarus', Minsk, BY

20. Sorokin, A. A. (1970) *Revolyutsionnoe i osvoboditel'noe krest'yanskoe dvizhenie v Zapadnoi Belorussii (1920-1939 gg.)* [The revolutionary and liberation peasant movement in Western Belarus (1920-1939], BGU, Minsk, BY

21. Stashkevich, N. S. (1985) *Prigovor revolyutsii: krushenie antisovetskogo dvizheniya v Belorussii. 1917–1925* [The verdict of the revolution: the collapse of the anti-Soviet movement in Belarus. 1917-1925], Universitetskoe, Minsk, BY

22. Vaŭpshasaŭ, S. A. (1963) *Na razgnevanai zyamli* [In the angry earth], Dzyarzhvyd. BSSR, Minsk, BY

23. Borisov, I. (1991) *Chelovek iz legendy: dokum. povest'* [The man from the legend: documentary story], Mastatskaya litaratura, Minsk, BY

24. Ladyseŭ, U.F. (1994) "Hard Way Test", *Belarus. gist. chasop.* [Belarusian Historical Journal], no. 1, pp. 81-88.

25. Fadzeeŭ, L. (1994) "Kiryla Arloŭski: hero or a thug?", *Svaboda* [Freedom], 13-19 dec.

26. Stasevich, Yu. (1995) "Partisan Western Belarus", *Pagonya* [Pagonja], 17-23 marc., 24-30 marc.

27. Grytskevich, A. (1994) "The history of geopolitics Belarus", *Spadchyna* [Heritage], no. 4, pp. 48-61.

28. Mezga, M. (1996) "The border confrontation (the position of Western Belarus after the signing of the Treaty of Riga 1921)", *Belarus. minuŭshchyna* [Past Belarus], no. 2, pp. 29-31.

29. Kastsyuk, M. P. (2000) *Sistema bal'shavitskai ulady na Belarusi* [Systems of Bolshevik power in Belarus], VP "Jekaperspektyva", Minsk, BY

30. Koŭkel', I. I. (1994) "Polish-Lithuanian conflict and the role in it of Belarusian political parties and organizations", in Mal'dzis, A. (exec. ed.) *Belarusika=Albaruthenica: Kn. 3 : Natsyyanal'nyya i regiyanal'nyya kul'tury, ikh uzaemadzeyanne* [Belarusika = Albaruthenica: Bk. 3: National and regional cultures and their interaction], Navuka i tekhnika, Minsk, BY, pp. 259–269.

31. Koŭkel', I. I. and Charnyakevich, A. M. (2002) "Partisan movement in the Grodno region in 1921-1925 years" in Kren', I. P. (ed.) *Slonimshchyna vachyma navukoŭtsaŭ i krayaznaŭtsaŭ: materyyaly regiyan. gist.-krayazn. kanf., prysvech. 750-goddzyu gorada Slonima i 70-goddzyu zasnavannya Slonimskaga raennaga krayaznaŭchaga muzeya imya I. I. Stabroŭskaga* [Slonimschina eyes of scientists and local historians: the materials of the region. Local History Conference dedicated to the 750th anniversary of the town of Slonim, and the 70th anniversary of founding of the Slonim District Local History Museum named after II Stabrovskaya], Slonim, BY, pp. 254-259.

32. Khvirysyuk, V. M. (1999) "Organization Guerrilla warfare in Western Belarus against the Polish authorities in 1921-1922", *Berastseiski khranograf* [Brest chronograph], ed. 2, BY, pp. 92-100.

33. Stuzhynskaya, N. I. (2011) *Belarus' myatsezhnaya: z gistoryi ŭzbroenaga antysavetskaga supratsivu ŭ 20-ya gg. XX stagoddzya. Vydanne drugoe, pashyranae* [Belarus rebellious: from the history of the armed anti-Soviet resistance in the 20-ies. XX century. Second edition, expanded], Nasha buduchynya, Vil'nya, LT

34. Tatarenko, A. (2006) *Nedozvolennaya pamyat'. Zapadnaya Belarus' v dokumentakh i faktakh: 1921-1954-e gody* [Unauthorized memory. Western Belarus in the documents and facts: 1921-1954], Arhiv AT, S-Peterburg, RU

35. Taras, A. E. (2012) *Anatomiya nenavisti* [Anatomy of hate], Kharvest, Minsk, BY

36. Śleszyński, W. (2007) *Bezpieczeństwo wewnętrzne w polityce państwa polskiego na ziemiach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej* [The internal security policy of the Polish state on the lands of the north-east of the Second Republic], RYTM, Warszawa, PL

37. Cichoracki, P. (2012) *Stołpce – Łowcza – Leśna 1924: II Rzeczpospolita wobec najpoważniejszych incydentów zbrojnych w województwach północno-wschodnich* [Stołpce – Lowcza – Leśna 1924: II Republic against the most serious armed incidents in north-eastern], LTW, Łomianki, PL

38. Linder, I. and Churkin, S. (2005) *Krasnaya pautina: tainy razvedki Kominterna. 1919-1943* [Red spider's web: the mystery of the Comintern intelligence. 1919-1943], RIPOL klassik, Moscow, RU

39. Gimzhaŷskas, E. (2013) *Belaruski faktar pry farmavanni litoŷskai dzyarzhavy ŷ 1915-1923 gg.* [Belarusian factor in the formation of the Lithuanian state in 1915-1923. 2nd ed.], Inbelkul't, Smolensk, RU

40. Kasparavichus, A. (2009) "The political role of the Belarusians in the diplomatic game Kovno and Moscow in 1920-1925 years", *ARCHE Pachatak* [ARCHE Home], no. 9, pp. 221-253.

41. (1997) *Materialy osoboi papki Politbyuro TsK RKP(b)-VKP(b) po voprosu sovetsko-pol'skikh otnoshenii. 1923-1945* [Materials special folder of the Politburo of the RCP(b)-VKP(b) on the issue of Soviet-Polish relations. 1923-1945], Institute of Slavic and Balkan Studies of the RAS, Moscow, RU

42. (1998) *Arkhivy Belaruskai Narodnai Respubliki, T. 1, Kniga 1* [Archives of the Belarusian People's Republic. T. 1. B. 1], Belaruski instytut navuki i mastatstva, Tavarystva belaruskaga pis'menstva, Nasha Niva, Vil'nya–N'yu-Erk–Mensk–Praga, LT, US, BY, CS

43. (1998) *Arkhivy Belaruskai Narodnai Respubliki, T. 1, Kniga 2.* [Archives of the Belarusian People's Republic. T. 1. B. 2], Belaruski instytut navuki i mastatstva, Tavarystva belaruskaga pis'menstva, Nasha Niva, Vil'nya–N'ju-Erk–Mensk–Praga, LT, US, BY, CS

44. (1999) *Komintern protiv fashizma: dokum.* [Comintern against fascism: doc.], Nauka, Moscow, RU

45. (2004) *Politbyuro TsK RKP(b)-VKP(b) i Komintern, 1919-1943: dokumenty* [Politburo of the RCP(b)-VKP(b) and the Communist International, 1919-1943: documents], Rosspen, Moscow, RU

46. Pashkevich, A., Vashkevich, A. and Charnjakevich, A. (ed.) (2009) *Karotki narys belaruskaga pytannya* [A brief sketch of the Belarusian issue], IP Logvinov, Minsk, BY

47. *Rasiiski dzyarzhaŷny arkhiŷ satsyyal'na-palitychnai gistoryi* [Russian State Archive of Socio-Political History] (RSASPH). F. 17. L. 63. C. 16.

48. *RSASPH*. F. 495. L. 123. C. 249.

49. *Dzyarzhaŷny arkhiŷ Brestskai voblastsi* [State Archives of Brest Region] (SABR). Fond 67. L. 4. C. 27.

50. *SABR*. F. 92. L. 1. C. 130.

51. *SABR*. F. 2028. L. 1. C. 37.

52. *Dzyarzhaŷny arkhiŷ Grodzenskai voblastsi* [State Archives of Grodno Region] (SAGR). Fond 200. L. 2. C. 7.

53. *SAGR*. F. 551. L. 1. C. 126.

54. *NARB*. F. 60p. L. 3. C. 587.

55. *NARB*. F. 242p. L. 2. C. 11.

56. *NARB*. F. 242p. L. 2. C. 12.

57. *NARB*. F. 325. L. 1. C. 57.

58. Charnyakevich, A. and Pashkevich, A. (2009) "A brief sketch of the history of relations of the Belarusian national movement and II Department General Command (General Staff) of the Polish Army in 1918-1923" *ARCHE Pachatak* [ARCHE Home], no. 8, pp. 22-73.

59. Sych, R. (2011) "Organization "Green Oak": anti-Polish aspect of the activities". *Moŷnakul'turnaya prastora Brestska-Pinskaga Palessya: zb. navuk. art.: u 2 ch.* [Lingvo-kultural space Brest-Pinsk Polesye: Coll. scientific articles: At 2 pm.], Brjest, BY, ch. 2, pp. 135-138.

## Информация об авторе

*Савич Александр Александрович* – канд. ист. наук, доцент. УО «Брестский государственный университет им. А. С. Пушкина» (бульвар Космонавтов, 21, 224016, Брест, Республика Беларусь). E-mail : uleks@tut.by.

## Information about the author

Savich Aliaksandr Aliaksandrovich – Ph. D. ( Hist.), Associate professor. Brest State University named after A.S. Pushkin (Kosmonavtov Boulevard, 21, 224016, Brest, Republic of Belarus). E-mail : uleks@tut.by

## Для цитирования

Савіч, А. А. Партызанскі рух у Заходняй Беларусі ў першай палове 1920-х гг. : стан і перспектывы даследавання / А. А. Савіч // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2016. – № 4. – С. 46–55.

## For citation

Savich A. A. Partisan movement in Western Belarus in the early 1920s: state and prospects of the study. Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus, humanitarian series, 2016, no.4, pp. 46-55.